


# Ведаць сваю гісторыю

## Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Ігар Марзалюк прэзентаваў у Магілёве сваю кнігу пра беларускіх калабарацыяністаў «Кроў на белым тле».

**Сустрэча з беларускім гісторыкам, грамадскім і палітычным дзеячам, членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам гістарычных навук, прафесарам адбылася ў архітэктурна-будаўнічым каледжы ў складзе Міждзяржаўнай адукацыйнай установы вышэйшай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт».**

Аўтар расказаў навучэнцам пра працэс стварэння кнігі, збор інфармацыі для яе, пра тое, як у кнізе на падставе багатых навуковых і архіўных крыніц аналізуе дзейнасць беларускіх калабарацыяністаў, якія супрацоўнічалі з нацысцкімі акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама раскрывае тэму важнасці захавання гістарычнай памяці.

– Ёсць рэчы ў нашым жыцці, якія перадаюцца праз вопыт людзей, праз настаўніцтва. Максімальна выкарыстоўвайце патэнцыял сваіх выкладчыкаў і навучыцеся прафесіі, таму што вельмі важна ў жыцці хаця б у адну рэч умець рабіць прафесійна, – звярнуўся да студэнтаў Ігар Марзалюк.

Паслухаць вядомага спікера прыйшлі таксама навучэнцы Магілёўскай дзяржаўнай санаторнай школы-інтэрната для дзяцей, хворых на сколіёз.

У завяршэнні сустрэчы Ігар Аляксандравіч адказаў на пытанні навучэнцаў.

У гэты дзень Ігар Марзалюк наведаў сваю альма-матэр, былы Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова, дзе таксама прэзентаваў выданне і паразмаўляў са студэнтамі.

Такія сустрэчы фарміруюць цвёрдую грамадзянскую пазіцыю і не даюць магчымасці перапісваць гісторыю нашай краіны.



**Валянціна ТАРАСЕНКА.**
*Фота аўтара.*